**Марыя Бень**

# Папараць-кветка

Аднойчы Аўдоцця размаўляла з мужам падчас працы. Было гэта ноччу на Купалле. Ён рэдка выходзіў на вуліцу, калі працаваў, а яна наогул ніколі. Трэба было сачыць за тым, каб агонь у печы гарэў ды дроў хапала. Ён амаль ніколі не адказваў на пытанні жонкі, калі працаваў. Здаецца, ён нават не чуў яе. Гэта засяроджанасць на працы выклікала адначасова і трапяткое захапленне, і лёгкі сум, і калючую крыўду ў грудзях жанчыны. Але яна ніколі не скардзілася на гэта (прынамсі – услых). Яго праца прыносіла дастаткова грошай, каб трымаць невялікую гаспадарку і самім жыць спакойна, не лічыць капейкі.

Дровы каля печы ноччу ніколі не канчаліся. Даніла ўдзень калоў іх і прыносіў у дом, але ў той раз ён працаваў ужо шаснаццатую гадзіну без адпачынку, таму Аўдоцця не смела нагадаць яму пра дровы, яна сама ціха выйшла з хаты і пайшла ў бок дрывотні, якая была амаль на ўзлеску. Ноч была ясная і халаднаватая. З боку ракі даносіўся дзявочы смех, выразна чуліся песні моладзі, якая сабралася ля купальскага вогнішча. Жанчына міжволі ўсміхнулася, успомніўшы, як калісьці таксама скакала праз вогнішча, варажыла на жаніха, пускала вянкі па вадзе… Менавіта ў купальскую ноч яна ўпершыню сустрэлася з Данілам, які тады прыйшоў на свята з суседняй вёскі… Задумаўшыя, Аўдоцця спатыкнулася і ўпала. Дровы пакаціліся па зямлі. Падымаючыся, яна адчула, як да яе твару дакранулася галінка папараці. Погляд, прабегшыся па кусце, зачапіўся за нешта белае, што нагадвала кветку. Вецер калыхаў лісты папараці, і яны перыядычна хавалі за сабой далікатную плямку. Жаночая рука міжволі пацягнулася за гэтым белым цудам. Аўдоцця хутка сарвала кветку і схавала ў кішэню мяккай камізэлькі. Здавалася, што нават праз тканіну яна адчувала дзіўнае цяпло.

Жанчына сабрала раскіданыя дровы і накіравалася ў бок дома, імкнучыся вярнуць сабе душэўную раўнавагу. Даніла выйшаў на ганак і цяпер разглядаў падвешаную лампадку, вакол якой кружыліся матылькі. Жонка ціха праслізнула міма яго і прайшла ў дом. Здаецца, Даніла нават не заўважыў яе, працягваючы захоплена назіраць за танцам матылькоў. Першыя два палены ўжо дагаралі ў печы, а мужчына ўсё стаяў каля дзвярэй. Паклаўшы ў агонь яшчэ адно палена, Аўдоцця падышла да дзвярэй і ўжо хацела адчыніць іх, але нешта яе спыніла, і жанчына апусціла руку. Здавалася, што кветка ў кішэні пякла ўсё  мацней, але яна, упэўненая ў тым, што трэба пагаварыць з мужам, адчыніла дзверы.

– Навошта ты так стараешся? – спытала яна і нават уздрыгнула, спалохаўшыся ўласнага голасу. Даніла маўчаў хвіліны тры, але для Аўдоцці яны здаваліся вечнасцю. Яна вырашыла, што адказу зноў не дачакаецца, і павярнулася да дзвярэй.

– Я хачу атрымаць прызнанне. Мне мала таго, што я маю зараз. Мне трэба нешта большае, – сказаў Даніла. Адчувалася, што словы даваліся яму цяжка. Пасля кожнай фразы ён уздыхаў. Аўдоцця шчыра не разумела мужа.

– У цябе ж ужо ёсць прызнанне. Усе ў вёсцы падтрымліваюць цябе.

– Ты не разумееш. Мне трэба, каб мяне ацаніў нехта вышэй. Уся гэтая чэрнь – не мой узровень. Я хачу большага.

Яго выказванне пра чэрнь палохала жанчыну. Ён ніколі раней не гаварыў так пра людзей, сярод якіх жыве. Даніла любіў сваіх суседзяў і жыхароў вёскі. Здавалася, быццам яго падмянілі. Аўдоцця не ведала, што адказаць, пакуль яе позірк не ўпаў на лампадку. Яна прамовіла ў задуменні:

– Ведаеш, матылькі ляцяць на агонь і згараюць… Але ён усё роўна вабіць…

Жанчына павагалася хвіліну, а потым дастала з кішэні маленькую кветку, адзін з пялёсткаў якога крыху загнуўся, і дадала:

– Не хацела табе гаварыць, але думаю, што табе гэта больш патрэбна. Я знайшла яе, калі ўпала ў траву сярод папараці.

Даніла некалькі секунд глядзеў на кветку, а потым засмяяўся, гледзячы кудысьці ўдалячынь.

– І ты верыш у гэтыя дзіцячыя казкі?! – усклікнуў ён, усе ж такі забіраючы кветку і прыглядаючыся да яе, а потым расчаравана дадаў:

– Дык гэта ж проста рамонак!

– А ты вазьмі! Вазьмі, Даніла, магчыма, кветка дапаможа табе! Невыпадкова я знайшла яе ў купальскую ноч! – супрацівілялася жанчына, з надзеяй гледзячы на мужа.

І ён забраў кветку. Пазней яна была засушана паміж старонкамі адзінай кнігі, што была ў доме – Бібліі. Даніла палюбіў той «рамонак». Як толькі садзіўся за працу, заўсёды клаў яго на край стала. Іншы раз былі такія моманты, што нічога ў яго не атрымлівалася, тады ён браў кветку ў рукі, задуменна глядзеў на яе – і натхненне вярталася зноў. Просты рамонак, знойдзены Аўдоццяй у папараці, як быццам і сапраўды стаў для яе мужа сімвалам шчасця, здавалася, што менавіта гэта кветка набліжала яго да ажыццяўлення запаветнай мары: дабіцца прызнання ад самой пані. Але праходзілі гады, разам з імі мінула маладосць, а мара так і засталася марай. Некалькі дзён Даніла хадзіў

задуменны, а вечарам зноў паклаў засохлую кветку ў Біблію, якую схаваў за абразы і больш не даставаў адтуль і нават не ўспамінаў… Здавалася, што ён забыў пра яе, а можа, вырашыў, што павінен дабіцца прызнання толькі уласнай працай. Але ці здолее ён пакарыць пані сваім талентам? Ці не лепш было перадаць сваё майсэрства вучням? Адказ на гэтыя пытанні дасць час…